Лешніца, К. Браслаўшчына. Відзы / К. Лешніца // Звязда. – 2023. – 23 жн. – С. 11.

## Браслаўшчына. Відзы

***Старыя паштоўкі з калекцыі Уладзіміра Ліхадзедава вядуць нас у віртуальнае падарожжа да Відзаў. На Браслаўшчыну. Праўда, падарожжа можа стаць і рэальным. Відзы валодаюць розным характарам прыцягнення. Палюбаваўшыся краявідамі гэтага паселішча ў пачатку ХХ стагоддзя (адна паштоўка з зімовым пейзажам чаго вартая! А яшчэ ж – і від на Відзы-Лаўчынскія з возера!), пераканаецеся, што наваколлі тут надзвычай сімпатычныя, яркія... І ўвесну, і ўвосень валодаюць асаблівым магнетызмам.***



Знаходзіцца гарадскі пасёлак (па колішнім часе – мястэчка!) за 40 км ад Браслава. Поруч – шэраг невялікіх азёраў. Зусім блізка, за 5 км, – граніца з Літвой, ненашмат далей – з Латвіяй. Праз пасёлак ідзе аўтамабільная дарога Браслаў – Паставы – Мядзел. Калі будзеце дабірацца не на сваім аўтамабілі, а звычайным аўтобусам, то вывучайце графік яго руху з аўтастанцыі Браслаў.

Сёння ў Відзах няма насельніцтва і ў дзве тысячы чалавек. А быў час, калі жыло тут некалькі тысяч – згодна з перапісам 1893 года. Такі лік звязаны, зразумела, з шырокім развіццём гаспадарчай дзейнасці ў час росквіту Расійскай імперыі, у складзе якой мястэчка знаходзілася з трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай.

У вайну 1812 года ў паселішчы знаходзілася стаўка Аляксандра І і Барклая дэ Толі. А 25–30 чэрвеня 1812 г. тут была галоўная кватэра Мюрата. 28 лістапада Відзы моцна пацярпелі ў баі паміж французамі, якія адступалі, і расійскімі войскамі.

У Відзы ў час вучобы ў Віленскім універсітэце – да свайго дзядзькі Маеўскага – наведваўся класік сусветнай паэзіі Адам Міцкевіч. У пачатку 1820-х гг. тут жыў расійскі рэвалюцыянер-дзекабрыст Аляксандр Поджыа. Відавочна, у час службы ў Праабражэнскім лейб-гвардыі палку. Адным з яго камандзіраў быў генерал-маёр Карл Карлавіч Пірх (1788–1822), герой вайны 1812 года, за Барадзіно быў адзначаны ордэнам Святой Ганны 3-й ступені. За бітвы ў Замежным паходзе рускай арміі ў 1813–1814 гг. – ордэнам Святога Уладзіміра 4-й ступені з бантамі, ордэнам Святой Ганны 2-й ступені з дыяментамі. Памёр Пірх у Відзах, дзе і пахаваны. А перад Пірхам Праабражэнскім палком камандаваў легендарны расійскі ваенны дзеяч барон Грыгорый Уладзіміравіч Розен (1782–1841)…

Вандруючы па сённяшніх Відзах, вы, вядома ж, значную частку сваёй экскурсіі аддасце на знаёмства з Троіцкім касцёлам. Яго яшчэ называюць касцёлам Нараджэння Дзевы Марыі. Пабудаваны храм у 1914 годзе. У яго сцены замураваны два артылерыйскія снарады Першай сусветнай... Вышыня касцёла – 59 метраў. Храм – адзін з самых высокіх у Беларусі... Год нараджэння стараверскай Успенскай царквы ў Відзах – 1907... Захаваліся і руіны каталіцкай каплічкі сярэдзіны XIX стагоддзя. Вадзяны млын належыць да канца XIX – пачатку XX стагоддзя. Яго выява засталася і на адной са старых паштовак.



**Відзы. Касцёл. 1915 год.**

Традыцыйная для беларускіх мястэчак гісторыя: тут жыло даволі шмат яўрэяў. У Вялікую Айчынную вайну нямецкія фашысты і іх паплечнікі знішчылі, разбурылі многія жыцці, не пашкадавалі ні старых, ні малых... Паселішча было пад ботам фашысцкіх катаў з 27 чэрвеня 1941 да 8 ліпеня 1944 года. Першых 50 яўрэяў у Відзах расстралялі ў чэрвені 1941-га... У наступным месяцы забілі яшчэ каля двухсот... А ўжо пасля сагналі тых, хто ацалеў, у гета. Акрамя старых і жанчын з дзецьмі, у Відзы трапілі і яўрэі з суседніх паселішчаў, тыя, хто не паспеў схавацца або ўцячы. У гета жыло недзе каля 1500 чалавек. Тэрыторыя была агароджана высокім плотам. Аховы не было. Выхад – свадобны. Рамеснікаў немцы выкарыстоўвалі па спецыяльнасці. Астатніх выганялі на розныя, якія толькі маглі прыдумаць, работы. У лістападзе 1942 года ў Відзы прыбылі паліцэйскія атрады, якія складаліся з літоўцаў і ўкраінцаў. Гета знішчылі ў снежні 1942 года. Частку вязняў расстралялі на беразе возера. А частку – пераправілі ў лагеры смерці ў Літву і затым у Еўропу. Існуюць сведчанні, што ў гета ў Відзах былі забітыя 2708 яўрэяў... Наведаўшыся да помніка расстраляным у мястэчку яўрэям, зазірніце і на старыя яўрэйскія могілкі. Усё гэта – неад’емная частка гісторыі нашай краіны.

Вандруючы па завулках і вуліцах Відзаў, ведайце, што гэтыя мясціны падаравалі гісторыі і культуры розных краін свету цікавых, адораных асоб. Адзін са знакамітых ураджэнцаў паселішча – ізраільскі пісьменнік, літаратурны крытык Натан Горан (1887–1956). Пісаў свае мастацкія і публіцыстычныя творы на трох мовах – ідыш, іўрыце і рускай. Вучыўся Натан у яўрэйскім вучылішчы ў Слабодцы (гэта таксама на Браслаўшчыне, бліжэй да Браслава, цяпер аграгарадок уваходзіць у склад Нацыянальнага парка «Браслаўскія азёры»). Дарэчы, будзеце мець час пасля экскурсіі ў Відзы, зазірніце і ў Слабодку, дзе вас чакае знаёмства з касцёлам «Сэрца Ісуса»... А што да Натана Горана, то з маладосці ён удзельнічаў у рэвалюцыйным руху. Быў арыштаваны ў 1906 годзе. Пасля вызвалення, у 1909 годзе, пачаў выступаць у друку з апавяданнямі з жыцця рэвалюцыянераў. Некаторы час пасля 1917 года жыў у Почапе, на Браншчыне. Пасля – у Віцебску. Працаваў літкансультантам мясцовага тэатра. З 1921 года – у Коўне (Каўнасе). Рэдагаваў штодзённую яўрэйскую газету. У 1935 годзе закончыў гістарычны факультэт Каўнаскага ўніверсітэта. Эмігрыраваў у Тэль-Авіў яшчэ да Вялікай Айчыннай... Натан Горан – аўтар дзевяці кніг.

З ураджэнцаў Відзаў вельмі цікавай асобай падаецца Яўген Аляксандравіч Фёдараў (1897–1961). Рускі савецкі пісьменнік. Удзельнічаў у Першай сусветнай вайне, штурмаваў Зімовы палац. У Грамадзянскую вайну партызаніў на Урале. Камандаваў эскадронам. Быў паранены. У перадваенныя гады напісаў кнігі пра калгаснае жыццё – «Камбайнеры», «Трактарыстка Еўланава», «Саламанея». У час Вялікай Айчыннай вайны – у складзе пісьменніцкай групы Паўночна-Заходняга фронту. Пракладваў «Дарогу жыцця» па лёдзе Ладажскага возера. Вайне, гераічным і драматычным падзеям барацьбы савецкага народа супраць фашысцкіх захопнікаў прысвяціў больш за 300 мастацкіх твораў. Яўген Фёдараў – аўтар трылогіі «Каменны пояс», над якой працаваў з 1940 да 1952 года, гістарычнага рамана «Ярмак» (1955 год; у дзвюх частках). Сярод баявых і працоўных узнагарод пісьменніка – ордэн Айчыннай вайны II ступені, два ордэны Працоўнага Чырвонага Сцяга, медаль «Партызану Айчыннай вайны» I ступені.



**Відзы-Лаўчынскія. Сядзібны дом: выгляд з возера. 1917 год.**

...Сабраўшыся паглядзець Відзы, не забывайцеся на астатнія краявіды і паселішчы Браслаўшчыны. І пра згаданую ўжо сядзібу Відзы-Лаўчынскія, у 1775–1816 гады маёнтак належаў генералу Тамашу Ваўжэцкаму. У Відзах-Лаўчынскіх у пачатку XIX стагоддзя працаваў курорт «Лазенкі» на аснове серавадародных крыніц... Не абмінайце і вёску Ахрэмаўцы, дзе месціўся маёнтак Бяльмонты... Дарэчы, на Браслаўшчыне ў Опсаўскай сярэдняй школе выкладаў беларускую і рускую мову і літаратуру і знакаміты наш сучаснік – аўтар слоў Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь Уладзімір Карызна. З браслаўскімі паселішчамі звязаныя лёсы паэта Уладзіміра Пецюкевіча, аўтара слоў да многіх песень, якія вельмі часта гучаць на Беларускім

радыё, пісьменніка Войслава Савіча-Заблоцкага, іншых знакамітасцяў – дзеячаў літаратуры, культуры, навукі і асветы…

**Кастусь ЛЕШНІЦА**
**Паштоўкі з калекцыі лаўрэата**
**Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь**
**«За духоўнае адраджэнне»**
**Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА.**
https://zviazda.by/